# Кола агню

**Шмат цікавых і незвычайных вырабаў з керамікі можна ўбачыць на выставе «Кола агню», што праходзіць у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Выстава праводзіцца па выніках 6-га міжнароднага пленэра па кераміцы "АРТ-Жыжаль".**



Свае працы прапаноўваюць паглядзець 25 прафесійных мастакоў-керамістаў з Беларусі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Румыніі, Украіны. Дэвіз пленэра — "Вопыт майстэрства: традыцыі і сучаснасць".

Пленэр такога кшталту — унікальная з'ява для Беларусі. Творчая група прафесійных мастакоў-керамістаў працуе пад адкрытым небам. "Мастакі-керамісты не проста мастакі: яны самі робяць печы для абпалу гліны, падрыхтоўваюць плошчу для працы. Тры дні яны займаюцца непасрэдна падборам твору, прадумваннем дэталяў. З дня дзесятага пачынаецца сама працэдура абпалу — сур'ёзная і карпатлівая праца, што праходзіць у напружаным рытме. Робіцца яна ўвечары і ўначы, часам да 2-4 гадзін раніцы. Дзесяць або пятнаццаць удзельнікаў працуюць на 2-3 печах рознай канструкцыі. Гэта досыць складана, патрэбна ўвесь час падтрымліваць пэўную тэмпературу", — паведаміла Юлія Сушчынская, навуковы супрацоўнік мастацкай галерэі "Універсітэта культуры".

Кожны год тэма пленэра мяняецца. У 2008 годзе яна гучала так: "Скульптура ў кераміцы". Таму ўсё, што можна ўбачыць на выставе, — варыяцыя на тэму скульптуры. "Фантастычная па форме і фактуры кераміка — вынік сучаснага мастацтва, калі, гледзячы на твор, можна дазволіць сабе паглыбіцца ў свет фантазіі і паспрабаваць уявіць, што сваёй працай хацеў сказаць мастак", — дадала Юлія Сушчынская.

Трэба аднак адзначыць, што многія працы выглядаюць даволі рэалістычна. Да прыкладу, работа Паўла Пазднякова "Паляўнічы", Аляксандра Гецава "Хамелеон", Вольгі Равінскай "Ураджай" і іншыя. На выставе можна ўбачыць вырабы, створаныя пры дапамозе самых розных тэхнік — з дымленнем, з рэдукцыяй паліўнага пакрыцця, абварнай, раку-керамікі, а таксама працы, што спалучылі розныя тэхнікі і прыёмы апрацоўкі.

**Луіза АЛАХВЯРДЗЯН.**
**Фота аўтара.**

## Прагноз надвор'я

**Сёння днём па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Па Гродзенскай, Брэсцкай, паўночна-заходняй палове Віцебскай і Мінскай абласцей ападкі (мокры снег, дождж). Вецер паўднёва-заходні 6—11 м/с. Тэмпература паветра +1 — +7°С.**

**У наступныя двое сутак па рэспубліцы чакаецца воблачнае надвор'е. Часам снег, мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночны 5—10 м/с, па захадзе парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу -4 — +2°С, днём 0 — +5°С.**

**Рэспубліканскі гідраметэацэнтр.**